**НЬЮ-ЙОРК.** "Я не згодзен з тымі, хто лічыць неабходным пашырэнне НАТО, і выступаю супраць дэбатаў па гэтай праблеме", — заявіў былы пасол ЗША ў Маскве Джэк Мэтлак. "Увогуле ж, я ўпэўнены ў тым, што гэтага не адбудзецца ў бліжэйшай будучыні па некалькіх прычынах, — сказаў ён у інтэрв'ю карэспандэнту ІТАР—ТАСС. — Па-першае, мала хто задумваўся над тым, у колькі гэта абыдзецца Злучаным Штатам. Па-другое, краінам Усходняй Еўропы ніхто рэальна не пагражае. Бяспека гэтых дзяржаў у значнай ступені залежыць ад іх унутранага становішча, эканамічнай сітуацыі".

## Леонид Кучма сомневается в подписании российско-украинского договора

***Президент Украины провел пресс-конференцию по вопросам внешней политики.***

Отвечая на вопрос журналистов, правда ли, что договор о дружбе и сотрудничестве между Украиной и Россией будет подписан в Москве, Л.Кучма заявил: "Такой договор будет подписан только в Киеве. Если вообще будет подписан". Главной проблемой были названы вопросы, связанные с Черноморским флотом, точнее — с территориями его дислоцирования, и введением на Украине двойного гражданства.

**Иван ТУЛИНСКИЙ.**

Египетский дневник

# Хургада — город на преКрасном море

## 1. Русская оккупация

***Этот египетский городок настолько мал, что есть не на каждой карте. В пятистах километрах юго-восточнее Каира на побережье Красного моря из куска пустыни трудолюбивые и упорные египтяне сотворили современную арабскую жемчужину — курорт Хургада.***

Весной, с марта по май, в пору африканского межсезонья, когда испепеляющий зной еще не пришел из Набийской пустыни, город превращается в туристскую Мекку. Немцы, французы, итальянцы, испанцы оккупируют местные отели, чтобы понежиться в теплых волнах чистейшего моря и через неделю вернуться домой с шоколадным отливом кожи.

Туристы, по словам арабов, как и добыча нефти, и Суэцкий канал — основной источник долларовых вливаний в экономику страны. И пару лет назад хургадинские отели были действительно переполнены многозвучием западноевропейских языков. Сегодня такого бума нет. Очевидно, политическая нестабильность в арабском мире, относительная близость Алжира, где фанатики-фундаменталисты устроили настоящую охоту за европейцами-христианами, отпугнули последних. Но шустрые египтяне быстро переключились на страны восточноевропейского региона. В первую очередь ставка была сделана на русского туриста. В марте нынешнего года на берег Красного моря отправилась и первая белорусская тургруппа. Это "Мингортурист" совместно с местной "Томми Турс" проторил новый маршрут.



## Отель "Марлин"

Купальный сезон в Хургаде открылся 9 марта. Мы прибыли девять дней спустя. На улице 24—26 по Цельсию, температура воды на 5 градусов холоднее. Семь часов автобусного пробега из Каира, и мы подъезжаем к фешенебельному четырехзвездочному отелю "Марлин". В огромном холле обслуга тотчас избавила нас от громоздких сумок и угостила бесплатным соком.

— Раша? Москау? — широко улыбаясь, спросил официант.

— Ноу! Бьелараша. Ай лив ин Минск. — отвечаю я.

— Миск? — глотая букву, араб виновато моргает глазами.

На пальцах пытаюсь объяснить, что это между Варшавой и Москвой.

— А, Москау! — снова обрадовался собеседник и подытожил. — Раша!

Да, для них мы все "раша" или "руссо туристо". Даже зловещее слово "Чернобыль" ни о чем не говорит.

Тем временем добыты первые сведения об отеле — рассчитан на 700 мест и к нашему приезду заполнен лишь наполовину. Есть бассейн. До моря 100 метров. Размещение в двухместных номерах с телевизором, кондиционером и, разумеется, со всеми удобствами.

С недоумением натыкаюсь на объявление по-русски: "Воду, газированные напитки и фрукты приносить в гостиницу запрещено. Привезенную водку распивать только в комнатах".

Про спиртное понятно — в Египте пьянство считается страшнейшим грехом (следом идет убийство), но в остальном дискриминация какая-то. Позже выяснил, что фрукты и соки можно купить тут же в холле, но в 2—4 раза дороже, чем в городе. Накрутка не только за сервис. Запрет диктует конкуренция. Удешевив стоимость проживания, можно привлечь больше постояльцев. А потерянное с лихвой восполняется такими, казалось бы, мелочными ограничениями. На ужине (шведский стол) мы столкнулись еще с одним — разнообразное меню: десятки аппетитных блюд, в том числе и сладких, — и ни капельки сока, даже воды. Плати 3 фунта (чуть меньше доллара). Хоть чай, хоть колу. И вынужден доставать кошелек. Но, заплатив, обязательно посмотри на чек и пересчитай сдачу. Вышколенная обслуга без комплексов — чаевые берет без спроса.

**Юрий НОЯРОВИЧ.**

**(Продолжение следует.)**

# Мечыслаў Грыб аб нейтралітэце Беларусі

## З выступлення Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Мечыслава Грыба на 93-й канферэнцыі Міжпарламенцкага саюза ў Мадрыдзе

У намаганнях па інтэграцыі ў сусветную дэмакратычную сістэму мы зыходзім з канстытуцыйнага палажэння аб імкненні нашай дзяржавы да нейтралітэту. Аднак у аб'ектыўна змяніўшымся свеце змяніўся і змест паняцця "дзяржаўны нейтралітэт".

На нашу думку, у сённяшнім свеце пераадоленага ў цэлым антаганістычнага супрацьстаяння сусветных сістэм нейтралітэт няўдзелу, нейтралітэт ізаляцыі і самаізаляцыі, гэта значыць пасіўны нейтралітэт, зжывае сябе.

Думаецца, што сёння дзяржаўны нейтралітэт павінен быць нейтралітэтам удзелу ва ўсіх магчымых несупрацьстаячых адзін аднаму, неантаганістычных аб'яднаннях, ён павінен быць нейтралітэтам інтэграцыі і ўзаемаінтэграцыі ва ўсе агульнасусветныя і рэгіянальныя аб'яднанні і адносіны, ён павінен быць актыўным нейтралітэтам.

Гэта значыць, што пры ўмове строгага прытрымлівання агульнасусветнага аб'ектыўнага інтэграцыйнага працэсу Рэспубліка Беларусь свабодна можа сумясціць удзел у ААН з удзелам у СБСЕ, удзел у Ташкенцкім дагаворы аб калектыўнай бяспецы краін СНГ з удзелам у Партнёрстве дзеля міру, пагадненне аб супрацоўніцтве з ЕС і эканамічны саюз з Расіяй. Але прынцыпова, на аснове захавання тых жа ўмоў, мая або любая іншая дзяржава магла б сумясціць удзел, скажам, у Ташкенцкім дагаворы з удзелам у НАТО.

Вынікам такога ўдзелу, такой узаемнай інтэграцыі і была б рэалізацыя новага тыпу нейтралітэту, які мы называем актыўным нейтралітэтам, калі на аснове ўзаемнай зацікаўленасці ніхто нікому не супрацьстаіць — усе з усімі супрацоўнічаюць.

Аднак толькі ва ўяўленні антаганістычнае супрацьстаянне сусветных грамадска-эканамічных сістэм і звышдзяржаў можа знікнуць раптам і назаўсёды. Нягледзячы на падзенне Берлінскай сцяны, аб'яднанне дзвюх Германій, падзенне савецкага сацыялізму і развал СССР, у нашым свеце даволі адчувальныя вынікі ваенна-палітычных сістэм.

Напрыклад, як інакш можна расцаніць той факт, калі, скажам, Рэспубліка Беларусь і Расія не з'яўляюцца членамі НАТО, а пэўныя сілы настойліва фарміруюць рух гэтай арганізацыі да іх заходніх граніц? Тут упаўне лагічна і магчыма заключэнне, што дадзенае фарміраванне ёсць праяўленне атавізму старога ваенна-палітычнага супрацьстаяння і "халоднай вайны". Гэта той выпадак, калі асобныя палітыкі працягваюць мысліць катэгорыямі "халоднай вайны". Гэта тая сітуацыя, калі Беларусь будзе пярэчыць супраць руху НАТО на Усход.

На аснове ідэі ААН аб адзіным грамадскім доме мая краіна гатова ўнесці варты ўклад у агульнасусветны працэс аб'ектыўнай узаемнай інтэграцыі краін, народаў і дзяржаў. Аб гэтым перакануча сведчыць першая ў свеце добраахвотная адмова Рэспублікі Беларусь ад валодання ядзернай зброяй. Аб гэтым сведчаць усе нашы міжнародныя кантакты.

# Сімайнс — самы "непісьменны" горад планеты

Самы "непісьменны" горад на планеце знаходзіцца не ў Папуа-Новай Гвінеі, не ў Афрыцы і не ў Азіі, а ў Бразіліі, якая ўваходзіць у дзесятку вядучых прамысловых краін свету. Сімайнс — так называецца гэты горад — размешчаны ў паўночна-ўсходнім штаце Піауі.

Паводле даных даследавання, праведзенага Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) сумесна з Бразільскім інстытутам геаграфіі і статыстыкі (БІГС), 75 працэнтаў дзяцей у Сімайнсе ва ўзросце ад 11 да 14 гадоў не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць. Як заявіў прадстаўнік адміністрацыі штата Піауі Сезар Форціс, такі высокі ўзровень непісьменнасці — вынік недахопу сродкаў і неабходнай інфраструктуры.

Паводле афіцыйных даных, узровень пісьменнасці ў сярэднім па Бразіліі складае 81 працэнт. Гэта ніжэй, чым у вядучых прамыслова развітых краінах, але вышэй за сярэдні ўзровень краін, якія сталі на шлях развіцця. Аднак у параўнанні з аб'ёмам нацыянальнага даходу расходы на адукацыю смешныя. У 1992 годзе ўрад выдзеліў на патрэбы асветы ўсяго 3,7 працэнта гадавога бюджэту.

З 30 мільёнаў бразільскіх дзяцей школьнага ўзросту 7,8 мільёна ніколі не наведвалі школы, бо вымушаны самастойна зарабляць на жыццё або дапамагаць бацькам утрымліваць сем'і. Паводле прагнозаў вучоных, да 2000 года ў самай вялікай краіне Лацінскай Амерыкі будзе налічвацца прыкладна 25 мільёнаў чалавек ва ўзросце да 18 гадоў, якія не будуць умець ні чытаць, ні пісаць.

**З Бразіліі — Андрэй КУРГУЗАЎ.**

Дайджест без политики

# Что пишут, то и читаем...

## Таможня дает "добро"

Эта крылатая фраза из бессмертного "Белого солнца пустыни" прозвучала на необычном торжестве в духовном училище Омской православной церкви.

Богослужение вел сам архиепископ Омский и Тарский Феодосий. Церковные песнопения исполняли лучшие певчие, а все присутствовавшие то и дело пожимали руки сотрудникам таможенной службы области. Именно они были главными виновниками торжества, поскольку вручали училищу 180 тысяч духовных книг.

Таможня книги, конечно, не покупала, а, как ей и положено, конфисковала у контрабандистов. Но результат в общем-то вышел таким же, как и намечался: книги вручены тем, кому они в первую очередь нужны. А сама таможня получила от владыки Феодосия в подарок за подарок "складенек" — походный алтарь.

*(Международная газета "Мегаполис-континент".)*

## "Пусть полетит как Иванов..."

В истории нашей космонавтики много еще неизвестных страниц.

Например, как пишет журнал "Чудеса и приключения", не редким было изменение фамилий космонавтов из дружеских соцстран. Вот поляки подобрали опытного летчика, а фамилия его — Хермашевский. "Не звучит!" — решили чиновники со Старой площади Москвы. И стал польский космонавт в наших газетах Гермашевским. Еще круче поступили с болгарским кандидатом. Был он по отцу и деду Какаловым. "Не годится! — заявили боссы. — Пусть полетит как Иванов". Так и полетел.

*("Труд".)*

## Какие "звезды" без охраны?

Две роскошные автомашины подкатили к дверям столичного "Палас-отеля". Из первого "Линкольна" сначала выскочили крепкие парни в строгих костюмах, затем появилась "звезда".

— Юрочка приехал! — взвизгнула одна из толпы поклонниц, и все бросились к своему кумиру. Но подойти к Юрию Шатунову, бывшей "звезде" "Ласкового мая", фанатки не смогли. Бравая охрана быстро отсекла девчонок от "объекта"...

Таким же образом бережет покой своей семьи Дима Маликов. У популярной певицы Анжелики Варум два охранника. Подобное использование охраны модно в столичном бомонде. Хотя многие весьма известные в шоу-бизнесе люди вовсе не держат телохранителей. К примеру, лидер "Машины времени" Андрей Макаревич, Костя Кинчев (группа "Алиса"), Лариса Долина, Маша Распутина, Вика Цыганова, солисты "На-на".

## Расценки на убийство

**(Для профессиональных киллеров в Москве)**

| Объект | Оплата в $ |
|---|---|
| Жена, муж | 2000—4000 |
| Любовница, любовник | 3000-5000 |
| Коммерсант-должник | 7000-12000 |
| Руководитель мафиозной группировки | до 20000 |
| Общественный деятель, связанный с криминальной структурой | более 20000 |

## Расценки на защиту

**(Для профессиональных охранников в Москве)**

| Объект | Месячная оплата в $ |
|---|---|
| Офис фирмы, банка | 200—1000 |
| Бизнесмен "средней руки" | 1000—2000 |
| Бизнесмен "крутой" | 3000—4000 |
| Ребенок, жена бизнесмена, квартира, дача | 2000—5000 |

*("Экспресс газета".)*

## Исторические анекдоты от Михаила Ардова

В истории семьи Кио есть один замечательный эпизод. Году эдак в шестьдесят втором младший сын фокусника Игорь в возрасте 18 лет завел роман с дочерью Леонида Ильича Брежнева — Галиной, дамой 36 лет, к тому моменту разведенной с первым мужем. (В те времена партию и правительство возглавлял Хрущев, а Брежнев занимал должность Председателя Президиума Верховного Совета.) И вот Галина Леонидовна и Игорь Эмильевич пожелали сочетаться законным браком...

Итак, регистрация брака совершилась, молодые получили свои паспорта с соответствующими печатями, а вслед за тем первым же самолетом отбыли в Сочи, где их ждал в шикарном отеле номер люкс. (Тут надобно заметить, что в те годы все постояльцы гостиниц были обязаны отдавать свои паспорта на хранение администратору.) Этим же вечером "зарубежные голоса" разнесли по эфиру светскую новость — 36-летняя дочь президента СССР Брежнева вышла замуж за 18-летнего сына циркового фокусника Кио. И только после этого кремлевское начальство (и сам Брежнев в том числе) узнали о совершившемся браке.

Вслед за сим "компетентными органами" был осуществлен трюк, которому мог бы позавидовать любой иллюзионист. Рано утром в номер к молодоженам постучали. Это была милиция.

— Вы не имеете права проживать вместе в одном номере.

— Почему же не имеем? Мы муж и жена...

— Ничего подобного, — сказал милиционер. — Вот ваши паспорта...

И им вернули их собственные паспорта, в которых не было никакого следа о регистрации брака — печати исчезли.

*(Журнал "Огонек", N 13.)*

## "От кутюр" из Торонто

Торонтская полиция обеспокоена интересом российской организованной преступности к... канадской моде. Мужской костюм, представленный на витрине модной лавки в богатом торонтском районе Йорквилл, может стоить около трех тысяч долларов. Но при определенных навыках и сноровке он достанется кое-кому бесплатно. Как сообщает торонтский детектив Дэй Флээр, пара умельцев может за 45 секунд очистить две полки с вещами общей стоимостью в 200 тысяч долларов. Через двое суток украденный "образец" будет уже красоваться на каком-нибудь мафиози в Москве. Оперативность преступников удивительна. Пока полиция составляет опись украденного, товар уже находится на пути в аэропорт, чтобы быть погруженным на самолет и отправиться в какой-нибудь пересыльный пункт, вроде Белграда, а затем в Москву.

*(Газета "Гермес-Время".)*

**Свежие газеты и журналы читал Иосиф КАЛЮТА.**

# Фотографии с американских спутников-шпионов заказывали? Получите!

**Джери СТИЛКИНД, ЮСИА**

Ученые надеются, что сделанные в 60-е годы спутниковые фотографии земного шара, которые американские разведслужбы планируют опубликовать в ближайшие полтора года, станут кладезем ценнейшей информации об экологии планеты.

Вице-президент Эл Гор, объявляя в феврале в штаб-квартире Центрального разведывательного управления о решении опубликовать эти фотографии, отметил, что они являются "золотой жилой прежде неизвестных данных".

По его словам, фотоснимки вулканов и районов активных смещений земной коры, вызывающих землетрясения, помогут ученым "прогнозировать стихийные бедствия и смягчать их эффект".

Эл Гор, кстати, выступал на фоне четырех фотоснимков, опубликованных в тот же день. На одном был запечатлен вулкан на полуострове Камчатка, снятый в ноябре 1962 г. Еще на одном фото, сделанном в августе 1962 г., Аральское море имело значительно большую площадь по сравнению с нынешней.

"Эти фотографии подчеркивают важность сегодняшнего мероприятия для специалистов, изучающих процессы перемен на Земле", — сказал вице-президент.

Шпионские снимки были сделаны американскими разведывательными службами на пике "холодной войны" с бывшим Советским Союзом. Помимо фотографирования оборонных объектов в бывшем СССР агентства собирали фотоматериалы и о многих других регионах мира с тем, чтобы составляемые карты и схемы были как можно более точными.

Всего будет опубликовано 860 тысяч снимков различных уголков мира, сделанных с помощью спутников-шпионов первого поколения. В 1972 г. на орбиту были выведены гражданские спутники, которые должны были собирать незасекречиваемые данные о состоянии земли, воды и воздуха для специалистов, изучающих погоду и экологическую ситуацию.

Изображения будут продаваться в виде фотографий Национальным архивом и Центром геологических исследований США.

## Казахстан восстановил таможенные посты с Россией

***Казахстан восстановил таможенные посты на границе с Россией, снятые в одностороннем порядке в начале года.***

На их ликвидацию республика пошла после подписания межправительственного протокола о введении между двумя странами режима свободной торговли, однако российская сторона посчитала, что еще не время для кардинальных действий и решилась только на отмену таможенных пошлин и количественных ограничений для казахстанских и российских товаров.

# Хорошо ездит тот, кто умеет считать...

***Как стало известно из Управления Белорусской железной дороги, здесь введена новинка — месячные абонементные билеты на пригородные поезда.***

Их продажа осуществляется железнодорожными кассами республики. Абонементы дают право проезда между указанными в них станциями. Об их покупке лучше позаботиться заблаговременно, однако не более чем за тридцать суток до начала действия.

Существует три вида месячных абонементных билетов: месячный именной льготный билет, месячный абонементный билет "выходного дня" на предъявителя, месячный абонементный билет на "предъявителя".

В первом документе указываются фамилия, имя, отчество полностью, плата за него берется из расчета примерно одиннадцати поездок, но ездить можно в течение месяца неограниченное количество раз. Если сравнить — выгода очевидна. Например, одна поездка от станции Минск-пассажирский до станции Борисов стоит 4 500 рублей, а абонемент — 46 130.

Во втором проездном документе фамилия не нужна, он — на предъявителя и действует на проезд по пятницам, субботам, воскресеньям, понедельникам, предпраздничным и праздничным дням по любому участку железнодорожного узла до зоны указанной в билете. При этом расстояние одной зоны десять километров.

Его месячная стоимость — тридцать шесть тысяч рублей.

В третьем месячном абонементе "на предъявителя" предусмотрены ежедневные поездки от станции оформления до зоны, указанной в нем, из расчета порядка двадцати трех поездок в месяц (стоимость одной поездки 4 500 рублей). При этом стоимость абонемента 96 400 рублей. Заметим, что подобным проездным документом может пользоваться любой представитель организации или учреждения — это удобно и выгодно. Кстати, оформление всех видов абонементов можно сделать по безналичному расчету, акцептованными поручениями.

Думаем, в преддверии праздника Великой Победы руководители предприятий могут сделать прекрасный подарок своим ветеранам и сотрудникам. С начала апреля на Белорусской железной дороге введены дополнительные пригородные поезда. На таких направлениях, как: Минск — Олехновичи, Минск — Осиповичи, Минск — Барановичи, Минск — Брест и Минск — Борисов.

**Алексей ВОЙТОВ.**

Крымінальная хроніка

## Замах на дэпутата

***Далёка не першакрасавіцкім жартам была сустрэча невядомых з дэпутатам Вярхоўнага Савета. Стрэлкі гадзінніка толькі-толькі перайшлі з сакавіка на красавік, як няшчасце звалілася на галаву народнага выбранніка — у грамадскім месцы пры выхадзе з падвальнага памяшкання Цэнтральнага аўтавакзала сталіцы на яго напалі чацвёра невядомых. Збілі. Патрабавалі каштоўныя рэчы і грошы. Пажывіліся ж толькі дыпламатам, у якім знаходзіліся дакументы.***

Дэпутат звярнуўся за дапамогай ва ўпраўленне ўнутраных спраў на транспарце, таму што інцыдэнт адбыўся за некалькі дзесяткаў метраў ад месца размяшчэння чыгуначнага аддзела міліцыі. На жаль, шанцы знайсці крыўдзіцеляў вельмі малыя, паколькі заява пацярпеўшага паступіла са спазненнем, а зламыснікі паспелі ўцячы, пакінуўшы яго з пабоямі.

## Не княжацкая смерць у вёсцы Княжыцы

***Жанчыну-пенсіянерку даставілі ў Верхнядзвінскую райбальніцу ў непрытомнасці, з чэрапна-мазгавой траўмай і ... нецвярозай. Пажыла ахвяра п'янай сваркі, як вызначылі ўрачы, зусім нядоўга — раны аказаліся смяротнымі.***

А забіла жанчыну не закаранелая злачынка, а сяброўка-пенсіянерка, з якой сустрэліся і "пагутарылі" за чаркай гарэлкі. Дарэчы, як пракаменціравалі сітуацыю ў прэс-службе МУС, у той час, калі ўсюды трубяць аб зверствах мафіі і арганізаванай злачыннасці, больш за ўсё крыві льецца менавіта "под крышей дома своего". Бытавая злачыннасць літаральна захліствае гарады і вёскі. А штурхае да пагібельнага выніку часцей за ўсё гарэлка.

## Прыём быў просты, але вартаўнік "не чуў"

***Крадуць часцей там, дзе ёсць магчымасць. А яе можна лёгка знайсці ў бабруйскім акцыянерным таварыстве "Фандок". Ноччу з будынка гэтага прадпрыемства-гіганта вынеслі найноўшага абсталявання з разраду "па апошнім слове тэхнікі" на многія мільёны рублёў.***

Прыём злачынцаў вельмі просты і нават прымітыўны: выставілі шыбу, узламалі металічную рашотку. Праз акно і вынеслі два маніторы і тры пульты кіравання камп'ютэрамі. Вартаўнік, па даўняй традыцыі, нічога "не бачыў і не чуў".

**Уладзімір СТРЭЛЬСКІ, Белінфарм.**



## Белдрагмет информирует:

***С 1 апреля 1995 года расчетные цены на драгоценные металлы, сдаваемые в Госфонд Республики Беларусь, установлены в следующих размерах:***

| Наименование | Расчетные цены в рублях за 1 грамм металла в чистоте |
|---|---|
| Золото | 142874 |
| Серебро | 1806 |
| Платина | 156105 |
| Палладий | 58569 |
| Родий | 244256 |
| Рутений | 4699 |
| Иридий | 16913 |
| Осмий | 159705 |

**Примечание.** Расчеты за золото, серебро и платину в изделиях и ломе, скупаемых у населения, производятся по прейскурантным ценам, утвержденным Комитетом цен Министерства экономики Республики Беларусь и действующим на момент скупки.

## Безденежье. Время продавать камни...

За 50 тысяч рублей купила обыкновенный булыжник продавец витебского магазина "Букинист" Г.Робинок.

Камень, доставшийся ей в остром поединке с конкурентами, — "тот самый, что носил за пазухой легендарный Нестерка" из одноименного спектакля. Он был выставлен на аукцион в Белорусском академическом драмтеатре имени Я.Коласа вместе с банкой огурцов, засоленных членами труппы, и зеркалом, сделанным в мастерских театра.

Щедро отдавали за эти "сокровища" свои деньги витебчане, пришедшие на театральный марафон. С его помощью коласовцы и еще 20 самодеятельных коллективов пытались собрать средства на ремонт крыши, полгода назад сорванной со здания театра ураганом. Представление, длившееся целые сутки, помогло собрать 75 миллионов рублей, которых, увы, не хватит даже на то, чтобы залатать хотя бы половину дыры в кровле.

**Александр ТУЛБУСОВ.**

# Кватэры, долары, аферы...

Гартаючы шматлікія рэкламныя выданні, не адзін раз натыкаўся на аб'явы, змест якіх зводзіўся да некалькіх слоў: фірма прадае кватэры ў Мінску. Напачатку не прыдаваў гэтаму вялікага значэння. У рыначны век кожны мае права што заўгодна купляць і прадаваць.

Але неяк, праглядаючы афіцыйныя справаздачы райвыканкамаў горада, вычытаў інфармацыю аб колькасці чаргавікоў і кошце адной кватэры. Супастаўляючы апошнюю лічбу і сярэднямесячную зарплату сярэднестатыстычнага грамадзяніна рэспублікі, сумеўся: хто ж дазваляе прадаваць жыллё і каму яно сёння па кішэні?

Праясніць сітуацыю дапамаглі супрацоўнікі падатковай міліцыі. Аказваецца, іх таксама зацікавілі тыя ж аб'явы ў газетах аб продажы кватэр. Толькі крыху з іншага боку. Супрацоўнікі службы хацелі даведацца, ці плацяць фірмы падаткі па гандлёвых здзелках. Наткнуліся ж на такое!..

Аферны механізм да балючага родны, айчынны. Так зрабіць можна толькі ў постсавецкай дзяржаве, бо ў цывілізаваным грамадстве ніхто да такога не дадумаецца, а калі і дадумаецца, дык грамадзяне краіны на аферу не "клюнуць".

Дык вось. Дапусцім, нейкая фірма А (да заканчэння следства поўнасцю яе не называем) ва ўпраўленні капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама на поўнасцю законнай падставе складае пратакол узгаднення, па якому абавязваецца заплаціць за, напрыклад, трохпакаёвую кватэру быццам бы для свайго супрацоўніка 6,5 тысячы долараў ЗША (маюцца на ўвазе вераснёўскія цэны мінулага года). А УКС выдзяляе кватэру.

Здаецца, ніякога крыміналу. Але гэта толькі здаецца. Бо, як высвятляецца, жыллё купляецца зусім не для супрацоўніка. Хаця фіктыўны дагавор аб прыёме на працу ўсё ж складаецца. Прычым з допісам аб абавязковым забеспячэнні жыллём.

Непасрэдна ў фірме рыхтуюць і яшчэ адзін дагавор, па якому грамадзянін-"супрацоўнік" абавязаны выплаціць фірме за кватэру... 12 730 долараў(?!). З абавязковай перадаплатай 6,5 тысячы. Прычым грошы не праводзяцца праз касу (ухіленне ад падаткаў), а бяруцца пад распіску. А пасля поўнага афармлення здзелкі ўсе паперы знішчаюцца.

У прыкладзе з нашай фірмай, па праўдзе кажучы, гэтага не здарылася. Бо выйшаў невялічкі канфуз. Камерсанты заключылі з жыхарамі сталіцы недзе каля 30 дагавораў па забеспячэнню жыллём. Ёсць у іх і пратакол узгаднення з УКСам. Не хапае толькі самага малога. Грошы за кватэры з людзей сабраны, а на адпаведны рахунак дзяржаўнай установы не пераведзены. Адпаведна паступілі і ў УКСе: ні аднаго квадратнага метра фірме пакуль што не дадзена.

Цяпер можаце ўявіць сабе настрой тых, хто пакваліўся на абяцанні фірмачоў?..

Зразумела, што дакументы па гэтай справе перададзены следству. Але самае цікавае не ў гэтым.

Аб'яў аб продажы кватэр у сродках масавай інфармацыі не паменшала. Падатковая міліцыя толькі за галаву хапаецца. Прыходзіцца сутыкацца і з тымі, хто сабраў грошы з людзей і ...канцы ў ваду, і з тымі, хто абавязацельствы перад кліентамі выконвае. Але кожны раз з падаткамі... цёмны лес.

І яшчэ адзін нюансік праблемы. З кастрычніка мінулага года, каб набыць кватэру ў Мінгарвыканкаме, трэба плаціць па 130 долараў за квадратны метр. Трохпакаёўка цягне ўжо прыкладна на 9,5 тысячы "зялёных". З наварам для фірмы пакупніку трэба выкладаць?!.. Самі падлічыце. Ці ў многіх з нас такія грошы ёсць? Выходзіць, афера параджае аферу. А ў пройгрышы — дзяржаўная казна і ўсе мы, падаткаплацельшчыкі.

**Віктар ХАРОШКА.**

# Балада пра партызанку

**Пятро ГАРЭЦКІ**

***На могілках у вёсцы Верхмень Смалявіцкага раёна ёсць магіла слаўнай партызанскай сувязной атрада імя Калініна Антаніны Трахімаўны Пратасевіч. Яе памяці — мае радкі.***

Гэта ў вёсцы было
Неспалоханым ранкам
У нядаўнім мінулым, час разлукі цяжкі:
Памірала ў хаціне сваёй партызанка,
А над ёю стаялі чатыры дачкі.
Яна ўсё аддала ім: нястомныя рукі,
На якіх пастаянна былі мазалі,
Гаварылі яны пра нястачу і мукі'
І любові да працы на роднай зямлі.
На дачок паглядзела ў астатні раз з болем
І згадала трывожныя некалі дні,
Маладую сваю партызанскую долю,
Што баліць, нават думкай калі закрані.
У завейныя ночы і дні непагоды,
Калі кожны адседзецца ў хаце быў рад,
Паўз засады яе пралягалі паходы,
А ў касе былі ўплецены весткі ў атрад.
Праплывала мінулае, быццам у мліве,
Не зацерла яго ў яе сэрцы сляды,
На дачок паглядзела:
— Жывіце шчасліва, —
Праказала і змоўкла навек, назаўжды...
Час ідзе... Над гранітным яе абеліскам
Сонца ў рань разлівае красу,
Хіляць голле бярозачкі нізенька-нізка,
Не расу, а ў зажуры раняюць слязу.

**Пераклад з украінскай Ул. ПАЎЛАВА.**

# Да нас едзе Ала Пугачова!

***Цэнтральны Дом афіцэраў, які адзначыў нядаўна сваё 70-годдзе, чакае сур'ёзнае выпрабаванне на трываласць. На 21 і 22 красавіка тут аб'яўлены сольныя канцэрты Алы Пугачовай.***

На жаль, большасць паклоннікаў расійскай суперзоркі могуць апынуцца за межамі тэатральнай залы. Па-першае, яе ўмяшчальнасць усяго тысяча месцаў. Па-другое, самы танны білет на балкон каштуе 300 тысяч рублёў, а самы дарагі — у партэр — ацэнены ў 700 тысяч.

Зрэшты, сустрэча з суперзоркай такога рангу каштуе гэтага. І не яе віна, што жыццёвы ўзровень нашых людзей такі нізкі. Як паведамілі карэспандэнту Белінфарма арганізатары гастроляў спявачкі, усю апаратуру, якая забяспечвае гук і святло, яна прывозіць з сабой, таму ў якасці тэхнічнага аснашчэння канцэртаў можна не сумнявацца — яна сапраўды будзе адпавядаць лепшым сусветным стандартам. Выкарыстанне фанаграм таксама выключана.

У Мінску Ала Барысаўна выступала ўжо двойчы. Першыя яе канцэрты ў беларускай сталіцы праходзілі ў маі 1979 года ў Палацы спорту. Другая сустрэча з ёй адбылася на стадыёне "Дынама" ў жніўні 1989 года. Трэба адзначыць, што пры ўсёй славе спявачкі яе патрабаванні да арганізатараў абмяжоўваюцца толькі прадастаўленнем асобнага катэджа і машыны. Што датычыць апошняй, то ў Мінску яе зноў будзе абслугоўваць "Чайка".

Трэцяе з'яўленне Пугачовай у беларускай сталіцы пройдзе ў немнагалюдным акружэнні. Яе світа будзе налічваць 21 чалавек, 19 з якіх — артысты балета "Рэцытал". Ці прыедзе разам з ёй малады муж або дачка Хрысціна, пакуль што невядома. Сустрэча з журналістамі ў праграме знаходжання Алы Барысаўны ў Мінску не прадугледжана.

**Віктар КУКЛОЎ, Белінфарм.**

# Машыніст зрабіў усё, што мог, але...

***У 11 гадзін 34 мінуты 5 красавіка ў Мінску на станцыі метро "Плошча Незалежнасці" пад электрычку кінулася жанчына. Машыніст прымяніў экстраннае тармажэнне, але было позна.***

Атрымаўшы сур'ёзныя траўмы галавы, грамадзянка Р. 1953 года нараджэння памерла на месцы. Як паказала папярэдняе следства, сведкі здарэння пацвердзілі, што гэта жанчына кінулася на рэйкі сама. Ёсць у міліцыі і даныя аб тым, што незадоўга да здарэння ў яе адбылася размова з сястрой, у якой яна паведаміла, што сёння ж пакончыць з сабой. Вядома таксама, што грамадзянка Р. нядаўна развялася з мужам, да кастрычніка мінулага года працавала ў мінскім бюро рытуальных паслуг. Ёсць звесткі, што яна была інвалідам другой групы па нервова-псіхічных захворваннях. Па гэтаму здарэнню міліцыя вядзе расследаванне.

**Таццяна СМІРНОВА, Белінфарм.**

# ДОМИНАТОР-2

## Это не реклама видеопремьеры. Это не пособие по бодибилдингу. Это поздравление с днем рождения.

Одной из ведущих финансовых компаний Республики Беларусь — компании "ДОМИНАТОР" — в конце марта исполнилось два года.

Быть может, в самом начале деятельности название этой компании и ассоциировалось с именем популярного киногероя-киборга. Но два года активной, цивилизованной работы в Беларуси рождают иные ассоциации при упоминании названия "Доминатор". Порядочность, стабильность и постоянный поиск — таковы они теперь.

— В свое время, выбирая имя новорожденному, мы руководствовались принципом "Как вы яхту назовете, так она и поплывет", — говорит финансовый директор компании Владимир Василевский. — Мы ставили перед собой цель занять доминирующие позиции на только зарождавшемся тогда рынке финансовых услуг. Насколько нам это удалось, наверное, виднее со стороны.

А со стороны можно увидеть следующее:

"Доминатор" сегодня — это, пожалуй, один из лучших партнеров в Беларуси по срочным взаиморасчетам с Россией, один из крупнейших операторов на рынке коротких денег, это профессиональный участник рынка ценных бумаг, получивший государственную лицензию на консультации и работу с ценными бумагами. Очереди в фондовый магазин "Доминатора", где, по мнению специалистов, можно очень выгодно продать свои приватизационные чеки или обменять их на акции специализированных фондов, говорят сами за себя.

И, конечно, финансовая компания "Доминатор" — это компания единомышленников, ясно представляющих свою стратегию развития.

— Мы все очень разные люди, но, может быть, именно в этом, в противоположности обычной картине, — наша сила: каждый из нас ценит своих коллег, уважает их мнение. Каждый имеет возможность заниматься тем, что ему ближе, и рассчитывать на помощь товарищей. Это позволяет нам органично дополнять друг друга, не ущемляя личности каждого, — заметил Денис Васильев, исполнительный директор "Доминатора".

Со стороны может показаться, что два года работы, пусть и в непростых "полурыночных" условиях, — не тот период, за который финансовая компания может добиться успеха. Но, оказывается, может и пример "Доминатора" — тому подтверждение. В компании гордятся тем, что сами, своими руками (или головой?), без посторонней помощи, связей сумели поднять "свое" дело, "состояться".

За два года список клиентов "Доминатора" расширился до тысячи частных фирм и государственных предприятий, клиентами компании стали ведущие белорусские и зарубежные банки.

— И что же, проблем нет? — спросили мы у Максима Воронкова, отвечающего в компании за связи с общественностью.

— Если бы не было проблем, то все бы ездили на "мерседесах". А если серьезно, то проблемы есть всегда, их великое множество. Одна из них состоит в том, что ядро нашей фирмы составили не экономисты и профессиональные управленцы, а математики. Поэтому приходится постоянно повышать профессиональный уровень и сотрудников, и свой, а времени, конечно, не хватает.

Правы те, кто утверждает, что ничего случайного в нашем мире нет. Точно так же не случаен успех "Доминатора" — он лишь следствие отношения финансовой компании к своим клиентам. Отношений, которые с первых дней строились на доверии, уважении к клиентам, заинтересованности во взаимовыгодном сотрудничестве. К слову, все сотрудники "Доминатора" (а это уже более 40 специалистов) демонстрируют эти качества — говорят даже об особой ментальности компании. Несмотря на достаточно агрессивное название, сотрудники "Доминатора" сумели покорить своих клиентов не только профессионализмом, но и... улыбчивостью. И хорошим настроением, которое у них не зависит от капризов погоды и конъюнктуры. Что, впрочем, неудивительно, поскольку занятие финансами — дело для них любимое, да и сами они — люди очень молодые. Средний возраст работающих в "Доминаторе" — 26 лет...

— Молодость не у всех вызывает доверие. Но в случае нашей компании этого не стоит опасаться. Ведь свойственные молодежи идеализм, максимализм и горячность уравновешиваются у нас здравым смыслом и опытом сорокалетних, — улыбается в усы генеральный директор компании Андрей Викторович Елисеев.

Финансовые компании — сравнительно новый, но динамично развивающийся сектор финансового рынка республики, где конкуренция достаточно сильна. Это не самый прибыльный вид бизнеса на сегодняшний день. Но развитой финансовый рынок, рынок ценных бумаг — неотъемлемый атрибут рыночной экономики. Впереди у него большое будущее.

"Доминатор", одним из первых придя в этот бизнес, и сегодня сохраняет ведущие позиции.

На то он и "ДОМИНАТОР".

**Агентство IPR.**

# ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

## Пятніца, 7 красавіка

### Беларускае тэлебачанне

**16.05** Да 50-годдзя Перамогі. Франтавы альбом.
**16.10** Вывучаем сваю гісторыю. "Бярэсце. Сустрэчы з мінулым".
**16.30** Канцэрт ансамбля "Бліскавіца". Частка 2-я.
**17.30** Цёмны пакой. Адказнікі ад арміі.
**18.00** АТН, Бі-бі-сі, Сі-эн-эн.
**18.45** Фінансавы час.
**19.00** Пратакол. Міжнародная праграма.
**19.15** Тэлесябрына.
**19.35** Дыялогі аб спорце.
**19.55** М. Кабалье і А. Анісімаў у праграме "Музыка без межаў".
**20.35** "Скрыжалі". Урокі Мантэня.
**20.41** Калыханка.
**21.00** Навіны.
**21.40** Студыя "Палітыка".
**21.55** Кліп-канцэрт.
**22.05** Вясёлы уік-энд.
**22.20** "Дзённік наёмнага забойцы". Маст. фільм (ЗША). У перапынку (23.00) — Навіны.
**0.10** Эканамікст.
**0.20** Шоу-прагноз.
**0.30** Пад купалам Сусвету.

### Канал "Астанкіна"

**8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 1.00** Навіны.
**16.00** Шпаргалка.
**16.05** Рок-урок.
**17.25** Хакей. Кубак МХЛ. Фінал. У перапынках — Бамонд; Добрай ночы, малышы!
**20.00** Час.
**20.45** Поле цудаў.
**21.30** "Праклён Дзюран". 4-я серыя.
**22.25** Версія.
**22.40** Погляд.
**23.20** "Пустыня". Маст. фільм.

### Канал "Расія"

**11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00** Весткі.
**16.20** У гэты дзень...
**16.25** Новая лінія.
**16.55** Дысней па пятніцах. "Сядзіба Кандэлшу". Маст. фільм.
**18.40** Гарачая дзесятка.
**19.25** Падрабязнасці.
**19.35** "Санта-Барбара".
**20.30** Гарадок.
**21.05** "Ню".
**22.30** Рака часу.
**22.35** Аўтаімгненне.
**22.40** Экран крымінальных паведамленняў.
**22.50** Чак Норыс у фільме "Наёмны забойца".
**0.25** Уваход па запрашальных білетах.

### Санкт-Пецярбург

**16.35** "Мясціны вясковага дзяцінства". Тэлефільм.
**16.45** Храм.
**17.15** Казка за казкай.
**17.50** "Крэм-брулe". Мультфільм.
**18.00** Тэлемагазін.
**18.05** Тэлебліц.
**18.10** Вялікі фестываль.
**18.50** Спартыўныя навіны.
**18.55** "Мануэла".
**19.45** Тэлеслужба бяспекі.
**20.00** "Дзве жанчыны". Маст. фільм (Італія).
**21.55** Спорт, спорт, спорт...
**22.10** Гараскоп.
**22.20** Анталогія зарубежнага кіно. "Ранішняя сустрэча з Джынджэр".

### 8-ы канал

**18.00** Мультфільм "Бабар".
**18.40** Асацыяцыя дзіцячай прэсы прапануе...
**19.00** РАДА-інфарм.
**19.15** Тэлесерыял "Арбалет".
**19.45** Муз-парад.
**20.00** Мультфільм "Качыныя гісторыі: Скарбы згубленай лямпы".
**20.15** Гарадскі гадзіннік.
**20.30** Тэлесерыял "Дракула".
**21.30** Студыя БМ.
**21.45** Час мясцовы.
**22.15** Дэтэктыў, баявік... "Брудныя гульні".

### НТБ

**17.00** Мультфільмы.
**17.30** "Цудоўная сямёрка".
**18.00, 21.00, 23.00** Сёння.
**18.35** Футбольны клуб.
**19.30** "Адзін шанц з тысячы". Маст. фільм.
**21.35** "Паліцыя Маямі. Аддзел нораваў.
**22.30** Часінка.
**23.15** "Сексуальная камедыя ў летнюю ноч". Маст. фільм (ЗША).

**Коллектив Управления делами Президента Республики Беларусь выражает глубокое соболезнование заместителю управляющего делами Президента Республики Беларусь КАШКАНУ Г.М. и его семье в связи со смертью матери.**

**Калектыў рэдакцыі "Народнай газеты" выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы газеты ПАЛЯНСКАЙ Галіне Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе цяжкім горам — смерцю бацькі.**

## Надвор'е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі — кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ў Віцебску — 4—6, Магілёве — 5—7, Гомелі і Мінску — 6—8, Гродне — 7—9, Брэсце — 8—10 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак часамі пройдуць ападкі, вецер парывісты. Тэмпература паветра будзе паступова паніжацца. 8-га ўначы ад мінус 3 да плюс 2, удзень — 1—6 градусаў цяпла. 9-га ўначы — 0—5 градусаў марозу, удзень ад плюс 3 да мінус 2.

## Астранамічны каляндар — 7.04

Узыход і захад сонца: Мінск — 6.29, 19.55; Віцебск — 6.17, 19.47; Магілёў — 6.18, 19.44; Гомель — 6.15, 19.41; Гродна — 6.42, 20.12; Брэст — 6.47, 20.08.

Даўжыня дня ў Мінску 13 гадзін 26 хвілін.

Першая квадра — 8 красавіка.



# ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ

ИХ ПРОЧИТАЮТ У НАС БОЛЕЕ МИЛЛИОНА ЧЕЛОВЕК

## Продаю:

- Недорого уч. 10 соток около Вячи. **Тел. (0172) 57-54-52.**
- 3-комн. коол. кв. в Поставах Витебской обл. **Тел. (02155) 2-10-77.**
- или меняю 1-к. квартиру в Горках Могилобл. **Тел. в Минске 539-648.**
- А/м М-2141 (1995 г.в., нулевой, 1700 куб. см, по б/н). **Тел. (0172) 975-434.**
- Гараж на Ангарской. **Тел. (0172) 430-113.**
- 2-сп. диван, велюр. **Тел. (0172) 564-153.**
- Рамы с подсборкой МАЗ-54323, 53371; двигатели, ШПГ, коленвал Т-25; АКБ-3ст215. **Тел. (0172) 554-228.**
- Спальни "Мара", "Мерингия", доставка, гарантия, ищу торговых агентов в обл. городах РБ. **Тел. (0172) 313-182.**
- Мотоблок МТЗ. **Тел. (0172) 560-603.**
- Дом около Орши. **Тел. (0172) 632-869.**
- А/м ГАЗ-330210 "Газель" 95 г.в. **Тел.: (0172) 51-68-42, 60-38-92.**
- Тракт. МТЗ-80. **Тел. (02144) 6-25-64.**
- Вяз. маш. "Нева-5". **Тел. (0172) 237-252.**
- Дом в деревне. **Тел. в Столбцах 54-413.**
- Уголок 45, трубу 25, черепицу керам., ворота гараж., забор мет., емкости 2 и 3 м³, окна, двери филенчатые, двери ДВП. **Тел. (0172) 331-356.**
- Жеребенка (1 год). **Тел. в Пухов. 99-473.**
- Мешки льняные б/у. **Тел. (0172) 541-067.**
- "Денди"— от 20 $, гар. до 1 года; компьютеры "Байт". **Тел. (0172) 621-640.**
- Памятник (мрамор). **Тел. (0172) 322-188.**
- Контактные линзы (пара — 30 $). Термобумагу для факса. **Тел. (0172) 47-01-54.**

## Куплю

▲ Осциллограф, измерительную аппаратуру до 40 Ггц. **Тел. в Молодечно (01773) 5-17-19.**

## Обмен

▼ А/м ЗИЛ-131 на трактор МТЗ. **Тел.: (0172) 482-334, 384-113.**

## Услуги

- Грузоперев. по Евразии. Оплата до п/н. **Тел. (0172) 537-073.**
- Настройка и ремонт пианино (недорого). **Тел. (0172) 52-44-04.**
- Анонимная наркологическая помощь: быстрое отрезвление, прерывание запоя, похмелья, кодирование, NLP. Минск, Некрасова, 22. **Тел. (0172) 32-31-03.**
- Центр "Дыхание по Бутейко". Кандидат мед. наук врач-терапевт гарант. полное излечение астмы, бронхита, верхних дыхательных путей, гипертонии, энуреза, геморроя, эпилепсии, псориаза, экземы, заболев., желудка, печени, щитовидной железы, женской патологии, ожирения, аллергии, луч. болезни и т.д. Метод запатентован Министерством здравоохранения. **Тел. Центра в Могилеве: 44-57-89, 26-85-88.**

## Разное

✦ Минская церковь "Благодать" проводит праздник Библии. 9 апреля в воскресенье специальное служение для вас в 9.00, 12.00, 15.00 и 18.00. Каждый пришедший получит в подарок Библию (Новый Завет). Наш адрес: ул. Гурского, 48. **Телефоны: 709-701, 707-486.** Проезд: авт. 23; трол. 8, 10, 31, 38 до ост. "Техникум". Можно ехать авт. 28, 57, 63, 75, 90; трол. 36, 39, 40, 53, 63 до ост. "Уманская". Приглашаем вас, вашу семью и ваших друзей.

✦ Утерянное удостоверение участника войны в Афганистане серия А № 224053 на имя Ковалева Юрия Владимировича считать недействительным.

✦ Утерянное удостоверение узника № 061044, выданное 23.07.1993 г. Лельчицким райсобесом на имя Маркевича Михаила Ивановича считать недействительным.

✦ Утерянный дубликат удостоверения ликвидатора аварии на ЧАЭС А № 402456 на имя Феоктистова В.А. считать недействительным.

✦ Утерянное удостоверение участника ликвидации последствий аварии на ЧАЭС № 234998 серия А на имя Кранщиковой Натальи Михайловны считать недействительным.

✦ Приглашаются все желающие узнать ближе церковь Иисуса Христа, Святых последних дней на беседы. Минск, ул. Калиновского, 12, среда, 19.30, суббота 16.00. Вы узнаете о живых пророках и апостолах, о Книге Мормона, данной человечеству самым чудесным образом. Можете обратиться письмом: 220100, Минск-100, а/я 46.

**Контактные тел. рекламного бюро: 68-25-28, 68-25-29, 68-28-11. Оплата объявлений — на р/с 609101 в Белбизнесбанке г.Минска, код 739.**



Народная газета

Даведкі па тэл.: 68-28-70; 68-25-59.
Рэкламнае бюро — тэл. — (0172) 68-28-11, тэл./факс — 68-25-29, (0172) 68-25-28 — факс.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Індэкс 63868

Заснавальнік — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.
Адрас: Мінск, вул. К. Маркса, 38.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка. 250 разоў у год.

Падпісана ў друк у 19.10. Заказ № 921.
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку". Адрас: Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Способ друку — афсетны, фармат А-2

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

В. а. галоўнага рэдактара Мікалай ГАЛКО